**ЗАДАННІ ГАРАДСКОГА МІЖПРАДМЕТНАГА КОНКУРСУ**
**“ШЛЯХАМІ ТВОРЦАЎ” (2024 г.)**

**Заданне 1. Выбраць верны варыянт адказу ці некалькі варыянтаў адказу.**

1. Палітыка, якая праводзілася ў БССР з ліпеня 1924 г., атрымала назву палітыкі ______________. Яе можна разглядаць у якасці састаўной часткі савецкай нацыянальнай палітыкі.
А) палітыка беларусізацыі;
Б) палітыка санацыі;
В) палітыка камасацыі;
Г) палітыка калектывізацыі.

2. Хто з ніжэйпералічаных асоб быў арганізатарам аб’яднання “Маладняк”?
А) Адам Бабарэка;
Б) Анатоль Вольны;
В) Алесь Дудар;
Г) Міхась Чарот.

3. Запішыце імя і прозвішча паэта, які прыдумаў і ўвёў у беларускую мову шмат новых слоў. Напрыклад: “летуценне”, “адлюстроўваць”, “мэтазгодна”.
А) Язэп Пушча;
Б) Уладзімір Дубоўка;
В) Янка Купала”;
Г) Тодар Кляшторны.

4. Пра каго казалі так “Прыйшоў …, за ім - пяцьсот”
А) Ян Чачот;
Б) Іван Банкрот;
В) Лявон Балот;
Г) Міхась Чарот.

5. Каго з паэтаў у друку называлі “новым Багдановічам”, “еўрапейскім паэтам у поўным сэнсе гэтага слова”? Яго творчасць вызначаецца інтэлектуальнай ускладнёнасцю, філасофскім падтэкстам.
А) Уладзіміра Дубоўку;
Б) Юлія Таўбіна;
В) Юрку Лявоннага;
Г) Уладзіміра Жылку.

6. Якая літаратурная арганізацыя на пачатку 1930-х гадоў фактычна пераўтварылася ў надлітаратурную і выпрацоўвала жорсткія ідэалагічныя схемы, строга сачыла за тым, каб у творах пісьменнікаў не было “шкодных адступленняў” ад гэтых схем?
А) “БелАПП”;
Б) “Полымя”;
В) “Узвышша”;
Г) “Маладняк”

7. Першай нацыянальнай мастацкай кінастужкай у Беларусі была “_________” (1926) рэжысёра Ю. Тарыча (па аповесці М. Чарота “________”)?
А) “Лясная быль” па аповесці “Ваўчаняты”;
Б) “Ваўчаняты” па аповесці “Лясная быль”;
В) “Лясная быль” па аповесці “Свінапас”;
Г) “Ваўчаняты” па аповесці “Свінапас”.

8. Хто з вядомых паэтаў “Маладняка” стаў адыёзным крытыкам пад псеўданімам Тодар Глыбоцкі, цкаваў у сваіх артыкулах “узвышэнцаў”?
А) Анатоль Ажгірэй;
Б) Аляксандр Дайлідовіч;
В) Тодар Кляшторны;
Г) Уладзімір Жылка.

9. У Канстытуцыі БССР 1937 г. вышэйшым заканадаўчым дзяржаўным органам называўся:
а) Вярхоўны Савет БССР;
б) Савет народных камісараў БССР;
в) Аблвыканкамзах;
г) Палітбюро Камуністычнай партыі Беларусі (бальшавікоў).

10. Разгон Першага Усебеларускага з’езду быў учынены па загадзе гэтага органа:
а) Бюро Цэнтральнага камітэта РСДРП(б);
б) СНК Заходняй вобласці і фронту;
в) Аблвыканкамзах;
г) ВРК Заходняга фронту.

11. Колькі беларускіх школ працавала на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1938/1939 навучальным годзе?
а) 359;
б) 0;
в) каля 100;
г) каля 50.

12. Палітыка перасялення сялян на хутары, якая заахвочвалася польскімі ўладамі ў Заходняй Беларусі, атрымала назву:
а) парцэляцыя;
б) камасацыя;
в) пацыфікацыя;
г) асадніцтва.

13. Хто стаў першым рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта?
а) Ул. Пічэта;
б) Ус. Ігнатоўскі;
в) А. Смоліч;
г) В. Ластоўскі.

14. Будынак Дзяржаўнай бібліятэкі БССР быў пабудаваны па праекце гэтага архітэктара:
а) І. Лангбард;
б) Г. Лаўроў;
в) У. Вараксін;
г) І. Запарожац.

15. Якую назву атрымаў кірунак грамадска-палітычнай думкі, які спалучае агульнадэмакратычныя ідэі і мэты з задачамі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення прыгнечаных народаў?
а) Нацыянал-дэмакратызм;
б) Сацыял-дэмакратызм;
в) Хрысціянская дэмакратыя;
г) Рэвалюцыйны нацыяналізм.

16. Які накірунак у авангардным мастацтве найбольш адпавядае духу “маладнякоўства”?
а) Супрэматызм;

б) Сімвалізм;
в) Футурызм;
г) Сюррэалізм.

17. Хто быў падпісантамі так званага “ліста трох”?
А) Андрэй Александровіч;
Б) Анатоль Вольны;
В) Алесь Дудар;
Г) Міхась Зарэцкі.

**Заданне 2. Расставіць падзеі ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці**

1. А) З’езд прадстаўнікоў Беларускай праваслаўнай царквы, на якім была абвешчана яе аўтакефалія (09.07.1927 г.);
   Б) Стварэнне беларускага Саюзу ваяўнічых бязбожнікаў (1925 г. ці 1926 г.);
   В) Пазбаўленне рэлігійных арганізацый права валодання зямлёй на тэрыторыях, падуладных бальшавікам (1917 г.);
   Г) Знішчэнне Свята-Пятра-Паўлаўскага сабору на Саборнай плошчы ў Менску (1936 г.).

2. А) Аб’яўленне незалежнасці БНР (25.03.1918 г.);
   Б) Пачатак працы I Усебеларускага з’езду (сьнежань 1917 г.);
   В) Стварэнне Літбел (27.02.1919 г.);
   Г) Першае абвяшчэнне ССРБ (30-31.12.1918 г.)

3. А) Увядзенне сямігодкі ў якасці асноўнага тыпу школы замест дзевяцігодкі ў БССР (1922 г.);
   Б) Стварэнне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1921 г.);
   В) Прыняцце пастановы СНК БССР аб увядзенні ўсеагульнага сямігадовага навучання ва ўсіх мясоцвасцяў рэспублікі (1932 г.);
   Г) Закрыццё рабфакаў (1939\1940 гг.)

4. А) Утварэнне Саюза пісьменнікаў БССР (1934 г.);
   Б) Рэарганізацыя “Маладняка” (1928 г.);
   В) Першы раскол “Маладняка” і ўзнікненне “Узвышша” (1926 г.);
   Г) Стварэнне БелАПП (1929 г.).

5. А) Фальсіфікацыя справы “Саюза вызвалення Беларусі” супраць дзеячаў беларускай культуры (1930 г.);
   Б) Самагубства Аляксандра Чарвякова падчас правядзення XVI з’езда КП(б)Б (чэрвень 1937 г.);
   В) Забойства (расстрэл) органамі НКВД больш за 100 прадстаўнікоў беларускай інтэлектуальнай эліты, з якіх 22 былі паэты (29.10.1937 г.);
   Г) Мікалай Гікала прызначаны першым сакратаром ЦК КП(б)Б (1932 г.).

**Заданне 3. Музычнае заданне. Пазнайце аўтара верша, на які напісана песня. Суаднясіце фотаздымак з аўтарам верша.**

**Заданне 4.**

**Частка А. Прачытайце звесткі аб гістарычных асобах. Выпраўце факталагічныя памылкі.**

| № | Гістарычная асоба | Адказы |
|---|---|---|
| **1** |  **Тарашкевіч Браніслаў Адамавіч** з'яўляўся адным з лідараў Беларускай сацыялістычнай грамады, а пасля яе распаду ў 1918 г. – Камуністычнай партыі Беларусі. У 1922 г. выбраны паслом (дэпутатам) сейма Польшчы, узначаліў у ім пасольскі клуб "Змаганне". Двойчы, у 1927 і 1931 гг, быў арыштаваны польскімі ўладамі і засуджаны адпаведна на 12 і 8 гадоў зняволення. У выніку абмену палітвязнямі з 1933 г. жыў у СССР. У 1934 г. быў асуджаны да вышэйшай меры пакарання і расстраляны. | 1.<br>2.<br>3. |
| **2** |  **Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч**<br>Беларускі гісторык і грамадскі дзеяч. У 1911 г. скончыў Маскоўскі ўніверсітэт. Да кастрычніка 1917 г. член партыі эсэраў. За ўдзел у рэвалюцыйным руху неаднаразова арыштоўваўся.<br>Прафесар БДУ, дэкан факультэтаў грамадскіх навук і педагагічнага, намеснік рэктара ўніверсітэта. З 1926 г. старшыня Інбелкульта. У 1929 —1931 гг. другі прэзідэнт Беларускай акадэміі навук. Напісаў шэраг навуковых прац— «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі», «Гісторыя Беларусі ў XIX і пачатку XX ст.», «1863 год на Беларусі».<br>Расстраляны ў 1931 г. | 1.<br>2.<br>3. |
| **3** |  **Цішка Гартны (Самуіл Яфімавіч Плаўнік)**<br>Працаваў фрэзероўшчыкам на заводзе «Вулкан».<br>Працаваў рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь», часопіса «Полымя».<br>Аўтар першага беларускага рамана «Паднятая цаліна».<br>У 1931г. за ўдзел у антыпартыйных групоўках і за сувязь з нацдэмаўскімі і фашысцкімі элементамі быў выключаны з Саюза пісьменнікаў БССР. Публічна пакаяўся і прызнаў свае памылкі.<br>У 1936 г. Цішка Гартны быў арыштаваны органамі НКУС. ,<br>Знаходзячыся ў турме, быў абвешчаны псіхічна хворым, у сувязі з чым пераведзены ў псіхіятрычную лячэбніцу, дзе памёр. | 1.<br>2.<br>3. |
| **4** |  **Юлі Таўбін (Юдаль Абрамавіч Таўбін)**<br>Геніяльны паэта заканчвае педтэхнікум у Мсціслаўлі. Свой першы верш надрукаваў, калі яму было 26 гадоў, у часопісе "Узвышша Калінішчы" (Клімавічы). Адна з самых значных паэм носіць назву "Таўрыда". Яго называлі "беларускім Арцюрам Рэмбо". 1933 годзе яго ў першы раз арыштавалі і выслалі ў Цюмень, дзе ён працаваў у мясцовым тэатры. Там Таўбіна паўторна арыштавалі і этапавалі ў Мінск. Апошні год жыцця ён правёў за кратамі, пад допытамі і катаваннямі, а 29 кастрычніка 1935 г. яму вынесены смяротны прысуд, які быў выкананы ў тую ж ноч. | 1.<br>2.<br>3.<br>4. |
| **5** |  **Уладзімір Жылка**<br>У 1923 годзе Жылка выехаў на вучобу ў Кракаўскі ўніверсітэт – як стыпендыянт чэшскага ўрада.<br>У 1926 г. быў запрошаны ў Мінск для ўдзелу ў навуковай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і застаўся тут жыць .<br>У 1927 г. быў выдадзены зборнік вершаў «З палёў усходніх крэсаў»<br>У 1937 г. Абвінавачаны ў прыналежнасці да міфічнага "Саюзу вызвалення Беларусі".<br>Памёр Уладзімір Адамавіч Жылка 01.03.1933 ад сухотаў у ссылцы. | 1.<br>2.<br>3. |

**Частка Б. Прачытайце вытрымкі з фельетонаў Анатоля Вольнага пра сваіх паплечнікаў-маладнякоўцаў, запішыце іх імёны.**

**1.** “**…** брандмэйстар „Маладняка“. Яго ўсе хваляць. Гэта ўжо прызвычаілася, надакучыла, няцікава.
Ну, хто-ж ня ведае, што ён добры паэта, гэтае лірычнае сапрана „Маладняка“. Але гэта, я-ж казаў, ужо празвычаілася. Я новае напішу пра…
“Калі гэта было, каб беларускі падпасак з-пад саламянай страхі, ды яшчэ з-пад Рудзенску, ды быў здольны, ды яшчэ і як здольны:
- І да паэзіі
- І да прозы
- І да драматургіі..”
“Малы **…** слухаў словы крытыкаў, сасаў матчыну грудзь, а потым адарваўся ад грудзі ды да маткі:
“Крыжам бы іх каля плоту!
Ды – трах!
Які тут страх?”
Потым гэтыя словы **…** запісаў у паэму “Босыя на вогнішчы”.

**2**. “Пішу пра таго паэта, пры выступленьнях разам з якім у прэзыдыум прыходзяць запіскі з запытаньнямі:
- Сямейны склад выступаючых паэтаў?
А потым ужо:
- Таварыш **…**, дазвольце з вамі пазнаёміцца.
… І таварыш **…** дазволіць пазнаёміцца, а на другі дзень затое таварыш **…** у роспачы будзе пісаць: “завядуць мяне людзі ў зьвярынец і напішуць рукамі не чапаць”.
У роспачы на другі дзень таварыш **…** п’е кефір і слабенькія віна.
“Люблю, кажа, піць каньяк, бо, напершае, ён кісьленькі, а па-другое не апьяняе”.
На выгляд **…** вельмі сымпатычны малады хлапчук.
…Вось чаму і запіскі прыходзяць у прэзыдыум…”
“**…** нам, рэдакцыйным працаўніком, вядомы тым, што ён шмат ходзіць.
Гэтай першапачатковай кваліфікацыі яго навучыў Галубок, у якога некаторы час працаваў, навучыў яго якасьці, неабходный для вандроўнага артыста.
Што і казаць, артыстам ад гэтага **…** ня стаў, але праз тое ходзіць ён шмат і ходзіць старанна.

“Яшчэ ў дзіцячыя гады **…** прызадумаўся над сваім будучым лёсам.
З расійцаў Пушкін, думал малады **…**, вырас у найвялікшага паэта, Гогаль у найвялікшага празаіка, Бялінскі ў найвялікшага крытыка, а яны да гэтага яшчэ і беларусамі не былі.
Паглядзім, што з мяне вырасце, рашыў малады **…** і пачаў пісаць разам і вершы, і прозу, і крытыку”.
“Рэвалюцыянэр з пялёнак”

**3.** “Здольны паэта. Усім вядома, што многія дзяўчаты, журыліся над сумам яго “Апошняй песьні” і над сумам тых вершаў, што вышлі пасьля яго “Апошняй песьні”. Але я новае хачу сказаць аб ім. На Украіне яго завуць “найкрашчы бузоцёр”.
**…** цяпер у Маскве на правох „приват-доцента, пополняющего свои знания“.
Наогул, яго маемасьць дае яму самыя шырокія магчымасьці перасоўвацца з гораду ў горад без насільшчыкаў, чым ён сумленна і карыстаецца ня менш, чым раз у месяц”

**4.** Беларусізаваўся **…** непасрэдна ў пялёнках, беларусізаваўся стала і канчаткова, бо гаворыць увесь час беларускай моваю, зусім не падазраючы, што гэта ён гаворыць на паднарэчыі вялікага расейскага нарэчыя, як гэта сьцьвярджаюць некаторыя дацэнты.
“**…** ўпарты і разумны сын Беларусі…
Адзін вучань на Аршаншчыне, калі яго запыталіся, што ён ведае аб **…**, - ухільна сказаў:
- **…** вучылі на папа, але поп з яго не выйшаў. Каб я быў сумленным праваслаўным, дык з тае прычыны я б толькі пашкадаваў бы, бо пры ўпартасьці **…** ён бы, нарэшце, канчаткова высьвятліў, як яно: бог існуе ці не, зноў жа калі існуе, дык які бог праўдзівы: жывацаркоўны ці мікалаеўскі.
Але, як той сказаў, поп з яго не выйшаў і таму ўсе клопаты за далейшы лёс чалавека палі на галовы літаратурных крытыкаў, бо **…** са ўсёй упартасьцю ўзяўся за літаратуру”

**Заданне №5**

**<u>Адкажыце на пытанні да наступных вершаў:</u>**

| | |
|---|---|
| **1.** На нашым карку торг спраўляе смела<br>Масква з Варшавай, з Рыгай і Літвой,<br>І наша змучанае катам цела<br>Штогодна новай кроіцца мяжой.<br><br>Масква сусвету вушы прашумела<br>Пра самавызначэнне аж да зор.<br>Смаленск дзе? Невель? Гомель дзе падзела?<br>Стварыла гомельскі ганебны калідор” | **Якую гістарычную падзею крытыкуе аўтар вершы? Запішыце дакладную дату гэтай падзеі і імя аўтара**. |
| **2.** Дол капалі яму далакопы даўно,<br>Далакопы чужыя, ня нашы:<br>-- Вы падмурак для нас, для сяўбы нашай гной,<br>Для жывёліны нашае паша…<br><br>Самі вінны ва ўсім. Ляжа ганьба на нас;<br>Наша воля, наш розум і сіла<br>Хай маўчаць і цяпер, ў гэты дзень, ў гэты час<br>Над глыбокай і сьвежай магілай. | **Кім, калі і з якой нагоды быў напісаны наступны верш?** |
| **3.**Такі разлом, туга такая!<br>І баюць байкі баюны<br>Северо-Западного края...<br><br>Плююць на сонца і на дзень.<br>О, дух наш вольны, дзе ты, дзе ты?<br>Ім мураўёўскі б гальштук ўздзець,<br>Нашчадкам мураўёўскім гэтым... | **Што такое “мураўёўскі гальштук” і каго аўтар называе “нашчадкамі мураўёўскімі”?** |
| **4.** Хачу<br>жыць,<br>падаючы,<br>але не занепадаючы.<br>Высока паднятым сілай часоў,<br>здабыць сталае месца на гале зямной.<br>Ведаю свае заганы.<br>Але гэта – мая задача.<br>Мне –<br>дваццаць першы год.<br>Жыцьцё ня за, а перада мной | **Хто аўтар верша і колькі год жыцця заставалася “перад ім”?** |
| **5.** Купалінка-купалінка, цёмная ночка,<br>Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка,<br>Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка.<br><br>Мая дочка у садочку ружу, ружу поліць,<br>Ружу, ружу поліць, белы ручкі коліць,<br>Ружу, ружу поліць, белы ручкі коліць. | **Хто і для якога мерапрыемства напісаў гэты верш?** |
| **6.** Хочу жыць,<br>Захлынацца і верыць.<br>Піць каханьня нязьведаны боль ..<br>**Дай** руку мне,<br>**Дай** вусны, дай сэрца,<br>**Дай** мне воч тваіх чад-алькаголь.<br><br>**Сёньня** п’яны вячэрнія далі,<br>**Сёньня** п’яна вішнёвая боль...<br>**Прамінайце**, юнацкія хвалі,<br>**Прамінайце** жыцьцёвую мель. | **Якую стылістычную фігуру на аснове лексічных паўтораў выкарыстоўвае аўтар у гэтым вершы?**<br>**Да якой лірыкі можна аднесці гэты верш?**<br>**Хто аўтр верша?** |

| | |
|---|---|
| **7.** “Гэта былі ўсё падлеткі гадоў па семнаццаць па восемнаццаць, а можа яшчэ і маладзей… Але ўсе яны былі шчырыя, простыя і надзвычайна вясёлыя хлопцы, — ён адразу пачуў сябе сярод іх сваім чалавекам, быццам з усімі знаўся ўжо не адзін год**.** Большая частка з іх былі поэты. Але, па-праўдзе кажучы, ня дужа лёгка было ў іх азначыць, дзе канчаецца поэта і пачынаецца звычайны чалавек. Былі сярод іх такія, што напісалі адзін ці два вершы, былі і такія, што ня пісалі зусім, — гэта, аднак, не перашкаджала ўсім ім мець агульныя інтарэсы і клапаціцца аб агульных справах. Адны з іх працавалі ў рэдакцыях беларускіх газэт і часопісаў, другія служылі ў іншых мясцох, трэція вучыліся, але ўся іхная праца, дзе б яна ні праводзілася, нейкім дзіўным парадкам злучалася ў адно суцэльнае…<br>Гэта быў малады атрад беларускага “Sturm und Drang‘a”, гэта былі гарэзныя дзеці нядаўнае рэволюцыйнае завірухі. | **Хто стаў правобразам “грамады”, якая апісваецца ў тэксце?**<br>**Патлумачце, што меў на ўвазе Міхась Зарэцкі пад словамі *“малады атрад беларускага “Sturm und Drang‘a”*.**<br>**Як склаўся лёс рамана “Крывічы”?** |
| **8.** Я не чакаў<br>І не гадаў,<br>Бо жыў з адкрытаю душою,<br>Што стрэне лютая бяда,<br>Падружыць з допытам,<br>З турмою.<br>Прадажных здрайцаў ліхвяры<br>Мяне заціснулі за краты.<br>Я прысягаю вам, сябры,<br>Мае палі,<br>Мае бары, —<br>Кажу вам — я не вінаваты! | **Хто аўтар твора, у якім годзе ён быў напісаны і якім чынам трапіў да чытача?** |
| **9.** Душа разагрэта вячэрнім агнём.<br>Трамвай праляцеў, як двухстопны анапэст,<br>І іскры дрыжаць за акном.<br>Я зь вершам праходжу жыцьцёвыя тракты,<br>Я зь вершам — і ў крозах, і ў сьне…<br>Харэі і ямбы, і пругкія дактылі<br>Заўсёды на варце ў мяне.<br>Мы пройдзем супольна і будзем змагацца,<br>Супольна зьбіваючы кожны рыф —<br>І стромкія сьцены алітэрацый,<br>І ўзгоркі клясычных рыфм. | **Якім вершаваным памерам напісаны верш?** |
| **10.** Падобны з твару да машчэй,<br>А па душы даўно нябожчык,<br>Ты жыў яшчэ, стары кашчэй,<br>Усё мінаеш хату з дошчак.<br>Жывеш і сохнеш – мільянер!<br>Адхватчык прэміяў і лаўраў,<br>Абы накалупаўся верш,<br>Адразу ладзіш гром літаўраў.<br>А шмат каго папрыбіраў,<br>Каб на шляху не замінялі,<br>І выйшаў суха з мокрых спраў<br>Ды выстукаў яшчэ медалі. | **Каму мог Уладзімір Дубоўка адрасаваць гэты верш?** |